# *§ 35-0. Гуманізм і Адраджэнне

## 1. Асноўныя этапы эпохі Адраджэння.

### ЭТАПЫ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ

| Ранняе | Высокае | Позняе |
|---|---|---|
| **XIV–XV стст.** | **Канец XV — першая палова XVI ст.** | **Другая палова XVI ст.** |
| Зараджэнне рэнесанснай культуры і яе пашырэнне ў Італіі | Найвышэйшы росквіт мастацтва і гуманістычнага светапогляду ў Еўропе | Сінтэз культуры Рэнесансу і Рэфармацыі ў Еўропе |

*Зараджэнне рэнесанснай культуры і яе пашырэнне ў Італіі ў XIV–XV стст.* У XIV–XV стст. у Італіі была сфармулявана філасофская сутнасць рэнесанснага светапогляду. Гуманісты паказалі адрозненне антрапацэнтрызму ад сярэдневяковай (тэацэнтрычнай) і антычнай (касмацэнтрычнай) філасофіі.

З'явілася канцэпцыя жывапісу як акна, расчыненага ў свет. Быў адкрыты закон прамой лінейнай перспектывы. Гэтыя мастацкія навацыі замянялі каноны сярэдневяковага жывапісу. На палотнах мастакоў пачала знікаць мяжа паміж светам зямным і светам нябесным.

Пачалося вывучэнне анатоміі чалавека і жывёл. Класічныя антычныя формы скульптуры былі злучаны з вобразамі біблейскіх персанажаў і славутых асоб. З'явіліся творы партрэтнага жывапісу, якія дэманстравалі духоўнае жыццё чалавека.

Растлумачце, чаму Адраджэнне называюць Рэнесансам. Якое сучаснае метафарычнае значэнне мае тэрмін «Адраджэнне»?

*Найвышэйшы росквіт мастацтва і гуманістычнага светапогляду ў Еўропе (канец XV — першая палова XVI ст.).* У канцы XV — першай палове XVI ст. актыўна развівалася свецкая літаратура. Адрадзіліся антычная драматургія — камедыя і траге-

дыя, эпічная паэзія — ода, гімн. Новы змест набыў сярэдневяковы рыцарскі раман. Удасканалілася і заняла пануючыя пазіцыі лірычная паэзія — санет, мадрыгал. Развіваліся эпіграма, элегія, балада. Была створана навела.

Мастацкая культура італьянскага Рэнесансу ў краінах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы змяшалася з мясцовымі традыцыямі ў архітэктуры, скульптуры, жывапісе. Вялікае пашырэнне атрымала кнігадрукаванне. Яно спрыяла ўдасканаленню тэхнікі гравюры.



*Лукская мадонна.*
*Ян ван Эйк. 1437 г.*



*Мадонна Літа.*
*Леанарда да Вінчы. 1490–1491 гг.*

Параўнайце прыведзеныя творы вядомых аўтараў. Што ў іх творчасці нагадвае нам пра Сярэднявечча, а якія рысы характарызуюць аўтараў як мастакоў Адраджэння?

*Другая палова XVI ст. — сінтэз культуры Рэнесансу і Рэфармацыі ў Еўропе.* У другой палове XVI ст. гуманісты ўсё часцей выказвалі думку пра тое, што ўнутраны свет чалавека з'яўляецца асновай яго ўчынкаў у сацыяльным жыцці, і папярэджвалі пра небяспеку страты асобай маральных якасцей.

Дзеячы еўрапейскай культуры імкнуліся адказваць на актуальныя пытанні сучаснасці. Яны ставілі сабе за мэту паказаць не толькі ўнікальнасць асобнага чалавека, але і гістарычную мінуўшчыну народаў. Гуманісты выступілі абаронцамі нацыянальных моў і прыступілі да стварэння іх літаратурных версій.

**2. Найважнейшыя дасягненні навуковай думкі XIV—XVI стст.** Філасофія эпохі Адраджэння спрыяла зацвярджэнню новага разумення еўрапейцамі часу, прасторы і спосабу вывучэння навакольнага свету. Сярэдневяковыя ўяўленні пра падзел свету на паднябесны, дзе час — псота і тлен, і наднябесны, дзе час — вечнасць, гармонія і дасканаласць, пачалі адыходзіць у мінуўшчыну. Зацвярджалася ідэя аднароднай прасторы — умяшчальні аб'ектаў матэрыяльнага свету, і аднароднага часу — паслядоўнасці перамяшчэння аб'ектаў і змены іх станаў.

Паўстала ідэя даследавання свету на аснове вопытных ведаў. Развіваліся анатомія і медыцына. Сфарміравалася традыцыя спецыяльнага адбору і захавання помнікаў гісторыі, з'явілася думка пра неабходнасць іх крытычнага аналізу з мэтай выяўлення падробак і фальсіфікацый.

У XVI ст. назапашаныя гуманістамі веды прывялі да ўсплёску навуковых адкрыццяў.

## НАВУКОВЫЯ АДКРЫЦЦІ

| Андрэас Везалій | Герард Меркатор | Андрэас Лібавій (Лібаў) | Уільям Гілберт |
|---|---|---|---|
| Склаў першы навуковы атлас па анатоміі чалавека | Прапанаваў выкарыстоўваць тэрмін «атлас» для набору геаграфічных картаў | Сістэматызаваў веды ў галіне хіміі | Вывучаў магнітныя і электрычныя з’явы і ўвёў тэрмін «электрычнасць» |

Чаму эпоху Рэнесансу сёння лічаць перыядам станаўлення сучаснай навукі?

Даследчыкі эпохі Адраджэння вылучаліся энцыклапедызмам сваіх ведаў. Напрыклад, Кандрат Геснер сістэматызаваў веды пра расліны і жывёл, стварыў мадэль бібліяграфічнага апісання кніг бібліятэкі і апісаў 130 моў, вядомых у XVI ст. еўрапейцам.

Адным з найбуйнейшых філосафаў навукі XVI ст. быў Мішэль дэ Мантэнь. Ён выказаў думку пра тое, што галоўнай адметнасцю чалавека з’яўляецца яго здольнасць рацыянальна разважаць пра ўладкаванне навакольнага свету. Не адмаўляючы быцця Бога, Мантэнь размежаваў веды і веру. Ён сцвярджаў нямогласць чалавечага розуму ў тлумачэнні звышнатуральнага свету і даказваў, што ў чалавечых справах розум павінен стаяць вышэй за аўтарытэт і рэлігійныя традыцыі.

**3. Праявы гуманістычных ідэй у грамадска-палітычнай думцы Расійскай дзяржавы.** Развіццё Заходняй Еўропы і маладой Расійскай дзяржавы адбывалася асінхронна не толькі ў сацыяльна-эканамічнай сферы, але і ў галіне навукі і культуры. У той час, калі на Захадзе пачынаўся яскравы культурны росквіт, у «Масковіі» адбывалася кансервацыя традыцыйнага ладу жыцця і праваслаўнага рэлігійнага светапогляду. Але і Усходняя Еўропа не была зусім ізалявана ад агульнаеўрапейскіх культурных працэсаў.

Пасля вызвалення Паўночна-Усходняй Русі ад «ардынскага ярма» пашыраюцца міжнародныя кан-

такты, намячаецца рост эканомікі і разам з тым — нарастанне актыўнасці гарадскога насельніцтва. У сярэдзіне XVI ст. адбылося афармленне дзяржаўных устаноў, у выніку чаго вырасла патрэба ў пісьменных людзях. Усё гэта вяло да з'яўлення новага стылю жыцця, мыслення, цікаўнасці да ведаў. У грамадска-палітычнай думцы новыя рэаліі знайшлі адбітак ва ўмацаванні ідэі самацэннасці чалавека. Запрошаны з Грэцыі для выпраўлення багаслужбовых кніг Максім Грэк у сваім «Вызнанні веры» зацвярджаў «права на разнадумства» ў спрэчках пра «самаўладдзе» чалавека. Так у рускую грамадскую думку было ўнесена адно з найважнейшых палажэнняў заходнееўрапейскага гуманізму.



*Партрэт Максіма Грэка. Малюнак са Збору твораў Максіма Грэка. Канец XVI ст.*

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Асаблівым феноменам рускай культуры было юродства. Юродзівыя ў вобразе жабракоў, калек, звар'яцелых старых смела выступалі з выкрывальнымі прамовамі на адрас вяльмож і нават цара, мелі значны аўтарытэт у грамадстве і карысталіся поўнай свабодай слова.

1. *Што такое юродства?*
2. *Чаму юродзівыя на Русі лічыліся «божымі людзьмі»?*
3. *У якім сэнсе гэтае слова ўжываюць сёння?*
4. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, назавіце імя юродзівага, якое замацавалася ў назве славутага маскоўскага сабора.*



*Сабор Пакроваў Прасвятой Багародзіцы, што на Рве. Расія, Масква*

**4. Унёсак ураджэнцаў Беларусі ў развіццё навукі і культуры.** Беларускія майстры зрабілі значны ўнёсак у развіццё рамеснай вытворчасці і дэкаратыўна-

прыкладнога мастацтва Расіі. Разам налічвалася больш за 60 спецыяльнасцей беларускіх майстроў, што трапілі ў Расію ў XVII ст. У рускіх палках падчас вайны служылі лекары і аптэкары з Полацка, Магілёва, Копысі, Шклова, Быхава і інш. Манахі, што перасяліліся з Оршы, прывезлі ў рускі Іверскі манастыр тыпаграфію — «друкарскі завод». Туды ж прыехалі пераплётчыкі і майстры — стваральнкі гравюр. Майстры-беларусы пабудавалі непадалёк ад Масквы папяровы млын, на якім выраблялася папера для маскоўскага Друкарскага двара. Збройнікі, што прыехалі з Магілёва, Віцебска, Дуброўна, Вільні, працавалі пры царскім двары. У Сярэбранай і Залатой палатах (майстэрнях) працавалі беларускія рамеснікі (пераважна з Віцебска і Полацка). Сярод вучняў славутага рускага іканапісца Сымона Ушакова былі і майстры-беларусы. Даследчыкі высветлілі, што з дзейнасцю першага ў Расіі прыдворнага тэатра звязаныя выхадцы з Беларусі (акцёры, стваральнікі дэкарацый, краўцы). Пераязджалі таксама беларускія спевакі і музыкі.

Найбольш вядомым прадстаўніком Беларусі з поўным правам можа быць названы Сімяон Полацкі, які зацвердзіў сваё імя ў самых розных галінах. Ён вядомы як таленавіты паэт, драматург, багаслоў, педагог, перакладчык. Лічыцца, што Сімяон Полацкі стаяў каля вытокаў расійскіх вершаскладання і мастацтвазнаўства. Вядомы ён і як выдавец (падрыхтаваў да друку таксама кнігі свецкага зместу), і адзін з заснавальнікаў першай вышэйшай навучальнай установы Расійскай дзяржавы — Славяна-грэка-лацінскай акадэміі.

Перасяленцы з беларускіх зямель адыгралі ролю своеасаблівых пасярэднікаў у культурным узаемадзеянні заходнееўрапейскай і расійскай цывілізацый. Праяўлялася гэта ў розных галінах. Так, беларусы, што пераналі на радзіме агульнаеўрапейскія матывы дэкору, актыўна ўкаранялі іх у рускае дэкаратыўнае

мастацтва і архітэктуру. Выхадцы з Беларусі перакладалі кнігі свецкага (гістарычнага) зместу з польскай і лацінскай моў на рускую і арганізоўвалі ў Расіі іх друк. Ураджэнцы беларускіх гарадоў стварылі ў Маскве школы, дзе вучылі дзяцей польскай і лацінскай грамаце.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, падрыхтуйце віртуальную выставу на тэму «Унёсак ураджэнцаў Беларусі ў развіццё навукі і культуры Расійскай дзяржавы».